# § 43. Знешнеэканамічныя сувязі Рэспублікі Беларусь

***Узгадваем.*** *Чаму краіны вымушаны займацца гандлем? Як адрозніваецца структура экспарту і імпарту развітых краін і краін, якія развіваюцца?*

**Беларусь у міжнародным падзеле працы.** Рэспубліка Беларусь падтрымлівае дыпламатычныя адносіны з 177 дзяржавамі свету. Са многімі краінамі склаліся двухбаковыя міждзяржаўныя пагадненні, на якіх будуюцца эканамічныя адносіны. Найбольш цеснае эканамічнае супрацоўніцтва ў Беларусі з краінамі-суседзямі, краінамі, якія ўваходзяць у агульныя міжнародныя арганізацыі (ЕАЭС, СНД і інш.), і краінамі, размешчанымі параўнальна недалёка ад яе межаў.

Вызначце па карце атласа (с. 3) памежныя краіны і краіны, аддаленыя ад Беларусі не больш чым на 1000 км.

Знаходжанне Беларусі ў цэнтры Еўропы на скрыжаванні транспартных шляхоў прадвызначае неабходнасць яе палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі Еўропы. Эканамічнае супрацоўніцтва развіваецца і з больш аддаленымі краінамі (Кітай, Венесуэла, Бразілія, Індыя, Судан, В'етнам і інш.).

Пасля Другой сусветнай вайны ў 1945 г. БССР увайшла ў лік 50 дзяржаў — заснавальніц *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*. Да цяперашняга часу Рэспубліка Беларусь бярэ ўдзел у рабоце шэрагу міжнародных арганізацый ААН: Еўрапейскай эканамічнай камісіі (ЕЭК ААН), ЮНЕСКА, Праграме развіцця ААН і інш. Пасля 1991 г. Беларусь стала членам такіх міжнародных арганізацый, як Міжнародны валютны фонд, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця і інш. Найбольш цеснае супрацоўніцтва ў Беларусі з дзяржавамі былога СССР: з 1991 г. яна ўваходзіць у Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД), з'яўляецца членам Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). *Узгадайце, у якія яшчэ міжнародныя арганізацыі ўваходзіць Рэспубліка Беларусь сумесна з краінамі былога СССР.*

У Беларусі ёсць галіны спецыялізацыі гаспадаркі ў сусветнай супольнасці. Яна пастаўляе на экспарт вялікагрузныя самазвалы, грузавыя аўтамабілі, трактары, халадзільнікі, хімічныя валокны, калійныя ўгнаенні, прадукцыю тэкстыльнай, швейнай, абутковай і харчовай прамысловасці. Брэндамі Беларусі з'яўляюцца БелАЗ, «Белкамунмаш», МАЗ, МТЗ, «Беларуськалій», «Белшына», «Мілавіца», «Камунарка», «Савушкін прадукт» і іншыя прадпрыемствы і аб'яднанні, прадукцыя якіх карыстаецца папулярнасцю сярод пакупнікоў з розных краін свету.

Пастаянна вядзецца пошук новых напрамкаў развіцця гаспадаркі. Пашыраецца роля краіны ў сістэме міжнароднага падзелу працы. Важкай

на сусветным рынку становіцца прадукцыя IT-кампаній ПВТ. Беларусь праводзіць палітыку інтэграцыі нацыянальнай эканомікі ў сістэму сусветнага гандлю.

**Геаграфія знешняга гандлю Беларусі.** Развіццё знешняга гандлю любой дзяржавы залежыць ад розных фактараў. Сярод іх — наяўнасць прыродных рэсурсаў, эканоміка-геаграфічнае становішча, узровень развіцця эканомікі і транспартная інфраструктура. *Узгадайце, якія мінеральныя рэсурсы Беларусі маюць экспартнае значэнне.* Краіна мае выгаднае геаграфічнае становішча ў цэнтры Еўропы, развітую транспартную сетку, што дазваляе развіваць знешні гандаль. Высокая кваліфікацыя працоўных рэсурсаў дае магчымасць выпрабляць на знешні рынак прадукцыю машынабудавання і хімічнай прамысловасці: вялікагрузныя аўтамабілі, трактары, тралейбусы, халадзільнікі, мікрапрацэсары, мінеральныя ўгнаенні, хімічныя валокны і інш. Сельская гаспадарка забяспечвае вытворчасць прадуктаў харчавання на экспарт: мяса-малочная прадукцыя, бульба і інш.

У той жа час у Беларусі мала энерганосьбітаў, горна-хімічнай сыравіны, руд чорных і каляровых металаў і прадукцыі металургічнай прамысловасці, легкавых аўтамабіляў, машын і абсталявання, бытавой тэхнікі, хімічнай прадукцыі, многіх прадуктаў харчовай прамысловасці, марской рыбы.

Знешнегандлёвы абарот краіны ўключае экспарт і імпарт тавараў і паслуг і моцна адрозніваецца па гадах (табл. 10). Як відаць з табліцы, у апошнія гады знешнегандлёвы абарот тавараў мае адмоўнае сальда, г. зн. імпарт перавышае экспарт. Перавышэнне аб'ёмаў імпарту над экспартам вядзе да дэфіцыту валютных рэсурсаў у краіне, што не спрыяе мадэрнізацыі яе гаспадаркі.

*Табліца 10* — Знешні гандаль таварамі, млн дол.

| Паказчык | Гады | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 2005 | 2010 | 2015 | 2017 |
| Усяго | 32687 | 60168 | 56952 | 63447 |
| Экспарт | 15979 | 25284 | 26660 | 29212 |
| Імпарт | 16708 | 34884 | 30292 | 34235 |
| Сальда | –729 | –9600 | –3632 | –5023 |

Гандлёвы абарот паслуг значна саступае экспарту і імпарту тавараў і мае дадатнае сальда на працягу апошніх гадоў (табл. 11).

*Табліца 11* — Знешні гандаль паслугамі, млн дол.

| Паказчык | Гады | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 2005 | 2010 | 2015 | 2017 |
| Усяго | 3483 | 7803 | 11024 | 12580 |
| Экспарт | 2342 | 4796 | 6634 | 7783 |
| Імпарт | 1141 | 3007 | 4390 | 4797 |
| Сальда | +1201 | +1789 | +2244 | +2986 |

Усе краіны пастаўляюць на знешні рынак тавары і паслугі ў адпаведнасці з міжнародным падзелам працы. Але нават самая высокаразвітая краіна свету не толькі экспартуе тавары і паслугі, але і імпартуе іх. Тавары і паслугі адрозніваюцца па відах, аб'ёмах, кошце. Для вызначэння знешнегандлёвага абароту краіны разлічваецца **знешнегандлёвы баланс**.

**Знешнегандлёвы баланс** — суадносіны кошту тавараў, вывезеных краінай або групай краін, і кошту тавараў, увезеных імі, г. зн. розніца аб'ёмаў экспарту і імпарту.

Беларусь экспартуе ў асноўным прадукцыю перапрацоўчых галін прамысловасці: высокатэхналагічную прадукцыю машынабудавання, хімічную прадукцыю, трыкатаж, абутак, прадукцыю харчовай прамысловасці, мінеральныя прадукты (у асноўным нафту і нафтапрадукты), вырабы з чорных і каляровых металаў (мал. 167).

У адрозненне ад экспарту *імпарт* тавараў Беларусі мае энергасыравінны характар. Найбольшую ўдзельную вагу ў структуры імпарту ў 2017 г. займаюць мінеральныя прадукты, машыны і абсталяванне, прадукцыя хімічнай прамысловасці, харчовыя тавары і сельскагаспадарчая сыравіна, чорныя і каляровыя металы і вырабы з іх. У параўнанні з 2005 г. беларускі экспарт павялічыўся ў 2017 г. у 3,3 разы, а імпарт — у 2 разы.

Буйнейшымі знешнегандлёвымі партнёрамі Беларусі за 2014–2017 гг. з'яўляюцца Расія (44 % знешнегандлёвага абароту), Украіна, Кітай,




Мал. 167. Таварная структура экспарту і імпарту Рэспублікі Беларусь, %

Вялікабрытанія, Германія, Польшча, Нідэрланды, Літва. З кожнай з гэтых краін знешнегандлёвы абарот перавышае 1 млрд дол. Пры гэтым з некаторымі краінамі (Вялікабрытанія, Нідэрланды, Літва, Украіна) у Беларусі дадатны гандлёвы баланс. Аб'ём экспарту ў Расію каля 12 млрд дол., імпарту — больш за 18 млрд дол. На другім месцы па экспарце прадукцыі знаходзіцца Украіна, у пяцёрку таксама ўваходзяць Вялікабрытанія, Германія і Нідэрланды. Галоўнымі імпарцёрамі тавараў у Беларусь, акрамя Расіі, выступаюць Кітай, Германія, Польшча, Украіна.

Пасля краін СНД і Еўропы па знешнегандлёвым абароце вылучаюцца краіны Азіі: Кітай, Індыя, Турцыя і інш. Найбольшыя гандлёвыя сувязі ў Амерыцы Беларусь развівае з Бразіліяй і ЗША. У Афрыцы асноўным гандлёвым партнёрам з'яўляецца Егіпет. Беларускія вытворцы асвойваюць новыя рынкі, прадаючы тавары і арганізуючы зборачныя вытворчасці.

Аб'ём замежнага гандлю паслугамі значна меншы, чым таварамі. За 2010–2017 гг. у сярэднім ён склаў каля 11 млрд дол. у год. Аднак тэмпы росту гандлю паслугамі апярэджваюць тэмпы росту гандлю таварамі. У структуры знешнегандлёвага абароту сферы паслуг пераважаюць транспартныя паслугі, на долю якіх прыходзіцца 44,3 % экспарту і 32,2 % імпарту (табл. 12). У экспарце і імпарце дастаткова вялікая доля будаўнічых паслуг і паездак. Высокая кваліфікацыя працоўных рэсурсаў абумовіла развіццё камп'ютарных паслуг, доля якіх у экспарце ў 2017 г. дасягнула 15,5 %. Усе астатнія віды паслуг у знешнегандлёвым абароце не перавышаюць 5 %.

*Табліца 12* — Структура экспарту і імпарту паслуг Рэспублікі Беларусь, %

| Віды паслуг | Экспарт | Імпарт |
|---|---|---|
| Транспартныя паслугі | 44,3 | 32,2 |
| Камп’ютарныя паслугі | 15,5 | 2,5 |
| Будаўнічыя паслугі | 11,5 | 19,1 |
| Паездкі | 9,7 | 20,1 |
| Паслугі па рамонце і тэхнічным абслугоўванні | 4,2 | 2,5 |
| Тэлекамунікацыйныя паслугі | 3 | 3,7 |
| Паслугі ў галіне рэкламы і маркетынгу | 2,1 | 1,4 |
| Аперацыйны лізінг | 1,4 | 2,2 |
| Паслугі ў галіне архітэктуры | 1 | 2,6 |
| Плата за выкарыстанне інтэлектуальнай уласнасці | 0,4 | 3,3 |
| Фінансавыя паслугі | 0,4 | 5,5 |
| Іншыя паслугі | 6,5 | 4,9 |

**Роля замежных інвестыцый.** Паспяховае развіццё эканомікі краіны на сучасным этапе немагчыма без інвестыцый, стварэння сумесных прадпрыемстваў, свабодных эканамічных зон. **Інвестыцыі** з’яўляюцца важнай крыніцай эканамічнага росту і развіцця краіны. Яны падзяляюцца на ўнутраныя (інвестыцыі банкаў, прадпрымальнікаў, арганізацый і ўстаноў краіны) і знешнія (замежныя інвестыцыі).

**Інвестыцыя** — размяшчэнне капіталу з мэтай атрымання прыбытку з вялікай ступенню рызыкі для інвестараў.

У 2017 г. унутраныя і знешнія інвестыцыі ў асноўны капітал у краіне склалі каля 20,4 млрд руб. Яны прыкладна пароўну размяркоўваюцца

паміж сферай вытворчасці і сферай паслуг. Найбольш значныя інвестыцыі ў будаўніча-мантажныя работы і затраты на вытворчасць машын і абсталявання. Інвестыцыі нераўнамерна размяркоўваюцца па відах эканамічнай дзейнасці. Найбольшая іх колькасць паступае ў прамысловасць і аперацыі з нерухомасцю, у сельскую гаспадарку і транспарт (мал. 168).




Мал. 168. Структура інвестыцый па відах эканамічнай дзейнасці

Важнае значэнне для развіцця эканомікі краіны маюць замежныя інвестыцыі. Беларусь шукае новыя формы знешнеэканамічных сувязей, шляхі прыцягнення інвестыцый для паскарэння эканамічнага развіцця. Але пакуль у параўнанні з краінамі-суседка аб'ём інвестыцый у беларускую эканоміку невялікі. У 2017 г. ён склаў каля 9,8 млрд дол. Варта адзначыць, што памер замежных інвестыцый не мае выяўленай дынамікі і залежыць ад эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў свеце. Структура замежных інвестыцый істотна адрозніваецца ад унутраных. Амаль палова інвестыцый — 43 % — прыходзіцца на гандаль, 21–22 % складае доля прамысловасці і транспарту, астатняе — іншыя віды эканамічнай дзейнасці.

Асноўнымі дзяржавамі, якія інвеставалі ў эканоміку Беларусі ў 2010–2017 гг., з'яўляюцца Расія (каля 6,2 млрд дол. у год), Вялікабрытанія (каля 2,6 млрд дол. у год), Кіпр (каля 0,8 млрд дол. у год). Буйныя інвестары — Нідэрланды, Аўстрыя, Украіна.

**Сумесныя прадпрыемствы.** У працэсе міжнароднай дзейнасці, акрамя інвестыцый, краіны ствараюць у Беларусі **сумесныя прадпрыемствы (СП)**.



**Сумеснае прадпрыемства** — форма ўдзелу краіны ў міжнародным падзеле працы шляхам стварэння ўдзельнікамі з розных краін прадпрыемства на аснове агульнай уласнасці, сумеснага кіравання, сумеснага размеркавання прыбытку і рызык.

СП маюць невялікі статутны фонд, імкненне да хуткай акупнасці, высокай рэнтабельнасці і некапіталаёмістасці. Першым сумесным прадпрыемствам у Беларусі быў «Белвест» у Віцебску — беларуска-германскае прадпрыемства па вытворчасці абутку. У цяперашні час у Беларусі функцыянуе амаль 3500 сумесных прадпрыемстваў і арганізацый, аптовы таваараабарот якіх складае больш за 4 трлн руб. Важнай функцыяй сумесных прадпрыемстваў з'яўляецца стварэнне працоўных месцаў. У дзейнасці СП задзейнічана каля 250 тыс. чалавек.

Найбольшая колькасць сумесных прадпрыемстваў у Беларусі з Расіяй. Сярод іх Мазырскі НПЗ, «Мідэа-Гарызонт», «Белтэлекабель» і інш. У галінах сферы вытворчасці сумесныя прадпрыемствы займаюцца дрэваапрацоўкай, машынабудаваннем, вытворчасцю мэблі, прадукцыі лёгкай прамысловасці, харчовых прадуктаў. У сферы паслуг асноўная ўвага надаецца гандлёва-пасрэдніцкай дзейнасці, транспартным паслугам, будаўніцтву. Беларусь, у сваю чаргу, стварае сумесныя прадпрыемствы ў іншых краінах (Расія, Украіна, Кітай, Туркменістан, Літва, Венесуэла і інш.).

**Свабодныя эканамічныя зоны.** Для стымулявання стварэння і развіцця вытворчасцей, заснаваных на новых і перадавых тэхналогіях, павелічэння колькасці працоўных месцаў, аб'ёму экспарту многія краіны ствараюць **свабодныя эканамічныя зоны (СЭЗ)** з асаблівым рэжымам. У Беларусі функцыянуюць шэсць СЭЗ, размешчаных у кожнай з абласцей краіны: *«Брэст»*, *«Гомель-Ратон»*, *«Мінск»*, *«Віцебск»*, *«Магілёў»*, *«Гроднаінвест»*. Яны ўтвараліся з 1996 па 2002 г. У цяперашні час рэзідэнты СЭЗ размяшчаюцца ў больш чым 35 населеных пунктах Беларусі.

**Свабодная эканамічная зона** — тэрыторыя са спецыяльным мытным, рэгістрацыйным і падатковым рэжымам, які дае прадпрыемствам магчымасць працаваць у асаблівых ільготных умовах.

Знайдзіце на картах атласа (с. 61–71) месцы размяшчэння рэзідэнтаў СЭЗ і вызначце заканамернасць іх размяшчэння.

У складзе СЭЗ вытворчай дзейнасцю займаюцца 410 прадпрыемстваў, на якіх працуюць 123,5 тыс. чалавек. Кампаніі, якія ўваходзяць у СЭЗ, вырабляюць і экспартуюць мэблю, упаковачныя матэрыялы, вырабы з алюмінію, лесаматэрыялы і будматэрыялы з дрэва, лом каляровых металаў. Асноўнымі спажыўцамі прадукцыі прадпрыемстваў СЭЗ з'яўляюцца Расія, Украіна, Казахстан, Германія, Польшча.

**Абагульнім і запомнім.** Беларусь уваходзіць у СНД, ЕАЭС, Саюзную дзяржаву з Расіяй, ААН, Сусветны банк і шэраг іншых арганізацый. Знешнегандлёвы баланс Беларусі мае адмоўнае сальда. Асноўны гандлёвы партнёр Беларусі — Расія. Унутраныя і знешнія інвестыцыі ў эканоміку Беларусі прыкладна пароўну размяркоўваюцца паміж сферай вытворчасці і сферай паслуг. У Беларусі функцыянуе каля 3500 сумесных прадпрыемстваў і шэсць свабодных эканамічных зон.

1. Удзельнікам якіх міжнародных арганізацый з'яўляецца Беларусь? 2. Якая краіна з'яўляецца асноўным гандлёвым партнёрам Беларусі? 3. На якія групы падзяляюцца інвестыцыі? 4. Назавіце тры краіны, якія з'яўляюцца лідарамі па замежных інвестыцыях у Рэспубліку Беларусь.

5. Прааналізуйце карту атласа (ст. 59) і вызначце, з якімі краінамі ў Беларусі найбольшы тавараабарот, і растлумачце чаму. 6. Чаму ў структуры экспарту і імпарту Беларусі пераважаюць мінеральныя прадукты і транспартныя паслугі? 7. Якія віды эканамічнай дзейнасці з'яўляюцца найбольш інвестыцыйна прывабнымі ў Беларусі для ўнутраных і замежных інвестыцый? 8. З якімі краінамі СНД і далёкага замежжа, на вашу думку, могуць быць створаны сумесныя прадпрыемствы?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Прааналізуйце структуру экспарту і імпарту Рэспублікі Беларусь і прапануйце новыя тавары і паслугі, якія могуць мець экспартнае значэнне. Прапануйце найбольш перспектыўныя напрамкі развіцця СЭЗ і размяшчэння іх рэзідэнтаў у населеных пунктах Беларусі.